
1


2


3

# Храмы кніг

У справе развіцця нацыянальнай культуры, прапаганды яе здабыткаў, збіранні і распаўсюджванні фальклорна-этнаграфічна спадчыны бібліятэкі займаюць адну з вядучых пазіцый. Супрацоўнікі гэтых устаноў культуры арганізоўваюць і ладзяць мноства культурна-масавых мерапрыемстваў — акцый, конкурсаў, выставак, пазнавальна-гульнявых і забаўляльных праграм, гутарак, творчых сустрэч з аўтарамі і прэзентацый кніг і інш.

Для дарослых карыстальнікаў бібліятэкі Мінскай вобласці прапануюць прыемнае інтэлектуальнае баўленне вольнага часу — праца клубаў, арганізацыя творчых сустрэч, літаратурных і музычных гасцёўняў, бенефісаў, правядзенне аглядаў навінак літаратуры, розныя прафілактычныя акцыі. Спецыялісты бібліятэк іграюць значную ролю ў павышэнні прэстыжу сям'і: на базе гэтых устаноў культуры працуе больш як 30 клубаў сямейнага тыпу.
Сёння ў Цэнтральным рэгіёне дзейнічае 391 бібліятэка. У бібліятэках рэалізуецца 248 міжнародных, рэгіянальных інфармацыйна-адукацыйных і асветніцкіх праектаў, 97 комплексна-мэтавых праграм. З самых яркіх праектаў трэба адзначыць рэгіянальны сацыяльны праект «Тата побач. Мама, давай пагаворым» (2020—2024) (Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева); праект аддзела па рабоце з дзецьмі «Бібліятэка для сям'і: выхавальнік на гадзіну» (Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Новік); інфармацыйна-асветніцкі праект па папулярызацыі кнігі і чытання «З кнігай па дарогах дзяцінства» (Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма); праект «Гартаючы гісторыі старонкі» (Мінская раённая цэнтральная бібліятэка); праект аддзела абслугоўвання і інфармацыі і Маладзечанскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва «Дарогай дабрыні» (Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча) і інш.
У 2022—2023 гг. рэалізоўваўся абласны літаратурна-краязнаўчы праект «Пісьменнікі — ураджэнцы роднага краю», у рамках якога ажыццяўлялася супрацоўніцтва з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры і яго філіяламі, з Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва, Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь і іншымі. Да праекту далучыліся і члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. У рамках гэтага праекта прайшоў абласны конкурс на найлепшы віртуальны рэсурс пра пісьменніка-земляка. Было створана 13 новых інфармацыйных рэсурсаў на сайтах публічных бібліятэк Бярэзінскага, Барысаўскага, Капыльскага, Крупскага, Лагойскага, Маладзечанскага, Мінскага, Слуцкага, Смалявіцкага, Старадарожскага, Стаўбцоўскага раёнаў, Цэнтральнай гарадской бібліятэкі Жодзіна, Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна, таксама ішла мадэрнізацыя ўжо існуючых — у Салігорскім і Уздзенскім раёнах. Рэалізацыя гэтага праекта паспрыяла папулярызацыі літаратурнай дзейнасці пісьменнікаў сярод землякоў. Праца па стварэнні падобных рэсурсаў у вобласці працягваецца.
Актыўна працуюць калектывы кніжніц з юнымі наведвальнікамі. Ва ўсіх бібліятэках вобласці праходзяць «Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі», мерапрыемствы да Дня ведаў, Дзень адкрытых дзвярэй на Дзень бібліятэк, цыкл мерапрыемстваў у канікулярны час, таксама рэалізуюцца рэспубліканскія акцыі «Бяспечныя канікулы», «Бяспека — у кожны дом», «Сябруем з законам», «Мая сям'я — мая краіна», «Тыдзень бацькоўскай любові», «Павага. Клопат. Адказнасць». Для маладзёжнай катэгорыі чытачоў сістэматычна праводзяцца мерапрыемствы па духоўна-маральным, патрыятычным, эстэтычным выхаванні і асвеце, прасоўванні здаровага ладу жыцця і г.д. Юныя наведвальнікі бібліятэк з задавальненнем удзельнічаюць у акцыях, конкурсах, віктарынах, турнірах, забаўляльна-гульнявых праграмах.
Вялікая ўвага надаецца і арганізацыі арт-прасторы кніжніц. Мастацкія і фотавыставы праходзяць у буйных раённых бібліятэках, такіх як Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка, Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева, Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча, Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка, Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка, Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса, Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна. Напрыклад, у апошняй быў прэзентаваны міжнародны арт-праект «Вечная жаноцкасць», арганізатарам якога з'яўляецца расійскі Фонд захавання і развіцця культуры, традыцыйных і духоўна-маральных каштоўнасцей і гістарычнай памяці «Унікальная краіна». У рамках праекта былі прадстаўлены работы мастакоў з розных краін: Уладзімір Сувораў,


4


5



6

1 ■ Падчас Міжнароднага семінара «Бібліятэка як сацыяльна-камунікатыўны інстытут грамадства».
2 ■ Матэрыялы, прадастаўленыя на XXXII Рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка — асяродак культуры», Мар'інагорскай гарадской бібліятэкай.
3 ■ Пушкінскі баль у Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна.
4 ■ Куток культуры Пакістана ў Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І.Х. Каладзеева.
5 ■ Падчас падвядзення вынікаў абласных конкурсаў.
6 ■ Юбілей Паўлюка Труса ў Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэцы яго імя.

Святлана Белаводава, Людміла Уткіна (Расія), Жазэфіна Уол (Вялікабрытанія), Фрэйдун Расулі (ЗША) і інш. Таксама тут адбылося ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае 225-годдзю з дня нараджэння рускага паэта, драматурга і празаіка, імя якога носіць установа. Святочнае мерапрыемства ўяўляла сабой баль у духу пушкінскай эпохі.
Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева ў рамках святкавання 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Пакістанам і Беларуссю сумесна з пакістанскім пасольствам адкрылі «Куток культуры Пакістана», які ўяўляе сабой калекцыю з твораў мастацтва, кніг, прадметаў побыту, сувеніраў і знаёміць наведвальнікаў з культурнай і мастацкай спадчынай гэтай краіны.
У рамках святкавання 80-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў Мінскай вобласці праходзілі розныя мерапрыемствы, сярод якіх унесеныя ў Рэспубліканскі план святкавання гэтых важных для краіны гістарычных дат: патрыятычная акцыя «Беларусь» і круглы стол «Партызанскі і падпольны рух у Беларусі ў 1941—1944 гадах», арганізаваныя Мінскай абласной бібліятэкай імя А.С. Пушкіна. Таксама ў вобласці прайшлі конкурс вершаў аб вайне «Мы вайну ўспамінаем вершамі», фотаконкурс «Чалавек народжаны для шчасця», арганізаваныя ў рамках патрыятычнай акцыі «Дарогамі Перамогі».
Бібліятэкі вобласці аснашчаюцца найноўшым тэхнічным абсталяваннем, маюць афіцыйныя сайты, уласныя электронныя базы даных і віртуальную даведачную службу, што робіць культурныя каштоўнасці даступнымі кожнаму.
Бібліятэкі паспяхова фарміруюць інфармацыйныя рэсурсы ўласнай генерацыі — электронныя каталогі, у рамках пошукава-даследчай работы ствараюць разнастайныя электронныя інфармацыйныя рэсурсы: фактаграфічныя базы даных, прысвечаныя гісторыі рэгіёна і вядомым суайчыннікам; краязнаўчыя бібліяграфічныя рэсурсы, віртуальныя базы даных аб земляках (героях вайны, партызанах, воінах-інтэрнацыяналістах і інш.). Асобныя публічныя бібліятэкі Мінскай вобласці наладжваюць цесныя сувязі з установамі культуры і адукацыі Расійскай Федэрацыі, удзельнічаюць у розных навукова-практычных канферэнцыях, семінарах, акцыях і конкурсах, падпісваюць пагадненні аб узаемным супрацоўніцтве. У сваю чаргу, бібліятэкі Расійскай Федэрацыі актыўна далучаюцца да мерапрыемстваў нашых бібліятэк: міжнародная акцыя «Reading-лакацыя "Новая зямля" — чытаюць сучаснікі» (2023) у рамках рэспубліканскай акцыі «Культурная сталіца года — 2023» у Слуцку, да якой падключылася 50 гарадоў Рэспублікі Беларусь і Расіі; Міжнародны навукова-практычны семінар «Бібліятэка як сацыяльна-камунікатыўны інстытут грамадства» на базе Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна, у якім удзельнічалі дакладчыкі з Мінска, Гродна, Гомеля, Санкт-Пецярбурга, Пскова, Вялікага Ноўгарада, Растова-на-Доне, Саранска, Арла, Улан-Удэ, Ніжняга Тагіла.
Важным напрамкам іміджавай і маркетынгавай палітыкі бібліятэк з'яўляецца інфармаванне чытачоў і жыхароў вобласці аб падзеях і навінах бібліятэчнага жыцця з выкарыстаннем як традыцыйных, так і сучасных сродкаў.
Кожны год публічныя бібліятэкі Мінскай вобласці з'яўляюцца ўдзельнікамі і пераможцамі Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры».
У XXXII Рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры» пераможцамі сталі пяць бібліятэк: Чурлёнская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя А. Новік — дыплом I ступені ў намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»; Мінская раённая цэнтральная бібліятэка — дыплом III ступені ў гэтай жа намінацыі. У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы» — дыплом I ступені ў Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэкі. У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу» — дыплом III ступені ў Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі. У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання» — дыплом II ступені ў Мар'інагорскай гарадской бібліятэкі Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі.
Папулярызацыя кнігі і чытання — прыярытэтны напрамак дзейнасці любой бібліятэкі. І кніжніцы Мінскай вобласці годна выконваюць сваю пачэсную місію. Ⓜ